# РАЗДЗЕЛ IX

# МЕДЫЯКУЛЬТУРА І ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЯ КРЫТЫКА

**Галіна Багданава**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## АСОБА МАСТАКА: ТРАДЫЦЫЙНЫЯ І НОВЫЯ СПОСАБЫ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ Ў СМІ

У гэтым годзе ў нашай краіне ўпершыню была прысуджана Нацыянальная прэмія па выяўленчым мастацтве. На жаль, СМІ даволі абыякава паставіліся да гэтай знакавай для нашай краіны падзеі. У Нацыянальным цэнтры сучаснага мастацтва за некалькі месяцаў да пасяджэння камісіі была наладжана вялікая выстава прэтэндэнтаў. І была нагода зрабіць інтэрв'ю з кожным, праілюстраваць публікацыі альбо тэлеперадачы цікавымі творамі. Але і пасля таго, як былі названыя лаўрэаты, у друку з'явілася толькі нязначная інфармацыя. Хаця большасць друкаваных выданняў маюць магчымасць рэпрэзэнтаваць творы ў колеры. Сярод лаўрэатаў былі знаныя асобы, пра якіх пісалі і пішуць шмат. Гэта народны мастак Беларусі Уладзімір Тоўсцік, старшыня Саюза беларускіх мастакоў Рыгор Сітніца. Былі тыя, гонар адкрыцця якіх належыць студэнтам і нядаўнім выпускнікам Інстытута журналістыкі (на старонках «Настаўніцкай газеты» нашыя студэнты ўпершыню прадстаўлялі Паліну Пірагову, Васіля Цімашова; у часопісах «Маладосць» [1], «Нёман» [2] – Алесю Скарабагатую). Але асобы Глеба Отчыка (атрымаў прэмію за роспісы ў храме ў Вішневе) і іншых, на жаль, мала вядомыя, хаця яркія творчыя асобы маглі б стаць арыенцірам для моладзі.

Сёння рэдка з'яўляюцца традыцыйныя і папулярныя некалькі дзесяцігоддзяў таму творчыя партрэты. Гэта жанр, што стаіць на мяжы літаратуры і літаратурна-мастацкай крытыкі, дазваляе вельмі вобразна прадставіць асобу героя. І пры жаданні ён можа быць мабільным. Нават у невялікім па аб'ёме матэрыяле вопытны арт-журналіст ці арт-крытык здольны даць чытачу ключ для разумення творчасці мастака. Але ў наш час аўтары часцей звяртаюцца да разгорнутых інтэрв'ю, эсэ.

Вопыт рубрыкі CATHEDRA на старонках часопіса «Маладосць», куды рыхтуюць матэрыялы студэнты пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі, сведчыць, што ў невялікіх эсэ ў празаічнай ці вершаванай форме можна вельмі дакладна вербальна перадаць візуальную вобразнасць як сталых майстроў (адзін з выпускаў быў прысвечаны Уладзіміру Зінкевічу), так і мастакоў-пачаткоўцаў. Больш за тое, прасторавыя вобразы набываюць развіццё ў часе. Падобныя публікацыі вельмі карысныя як для творцаў (іх разумеюць!), так і для гледачоў-чытачоў (ім даецца ключ для разумення творчасці, ключ для разумення асобы мастака, таму што менавіта ў творах адлюстроўваецца душа аўтара).

Студэнты I і III курсаў факультэта журналістыкі напісалі невялікія, але вельмі яркія эсэ (кожны пра адзін-два творы) з выстаўкі Алесі Скарабагатай, якая экспанавалася ў канцы 2016 года. Гэта быў дыялог у вобразах, філасофскае спасціжэнне нашага часу і нашай прасторы. І вось у 2017-м менавіта Алеся Скарабагатая стала адным з лаўрэатаў Нацыянальнай прэміі па выяўленчым мастацтве (намінацыі «Дэбют», «Глядацкая сімпатыя»). Скажаце, супадзенне? Не, проста СМІ былі, ёсць і будуць чацвёртаю ўладай. Першымі заўважыць, зразумець і першымі расказаць пра таго, хто ёсць Асоба ў мастацтве, у літаратуры, культуры. Магчыма, тады маладыя людзі не страцяць нармальныя арыенціры ў жыцці, задумаюцца не пра імклівае сёння, а пра вечнасць, і ў побыце навучацца бачыць быццё, як гэта ўмеюць рабіць сапраўдныя мастакі.

Такім чынам, арт-журналіст можа адшукаць прыклады яркіх асобаў у мастацтве (на выстаўках, пленэрах, конкурсах), падрыхтавацца (інтэрнэт дае дастаткова інфармацыі) і зрабіць цікавае інтэрв'ю, у якое варта смела ўключаць свае ўражанні ад твораў (нагодаю можа стаць і адзін твор). Можна напісаць эсэ або серыю эсэ з выстаўкі пра аднаго ці некалькіх мастакоў (гэтая публікацыя можа быць сумеснаю). Усе выступленні ў СМІ на тэму выяўленчага мастацтва ёсць магчымасць цікава праілюстраваць. Падобныя публікацыі могуць скласціся ў рубрыкі.

Мы вялі гаворку пра прадстаўленне ў СМІ сучасных беларускіх мастакоў. Але эсэ ці падборка эсэ выдатна падыдуць і для рэпрэзентацыі нашых класікаў, мастакоў іншых краін. Інтэрв'ю можна замяніць знойдзенымі ў друку выказваннямі свайго героя.

*Літаратура*

1. Восень колеру снегу // Маладосць. – 2017. – № 2. – С. 93–104.
2. Мальчевская, Е. Характер вещей / Е. Мальчевская // Нёман. – 2012. – № 6. – С. 2.